УДК 882.6.09/092/Колас+882/092/Гогаль/

***Ж.С. ШАЛАДОНАВА***

# ПРАДМЕТНА-РЭЧЫЎНЫ СВЕТ ТВОРАЎ Я. КОЛАСА І М. ГОГАЛЯ: НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ МАСТАЦКАГА ЎВАСАБЛЕННЯ

*У артыкуле аналізуюцца сэнсавы патэнцыял і функцыянальныя магчымасці вобразаў ежы ў ідэйна-сюжэтнай арганізацыі твораў Я. Коласа і М. Гогаля. Даказваецца, як праз этыку трапезы праяўляецца чалавечая духоўнасць, што дазваляе вывесці вобразы ежы за межы гастранамічных значэнняў у быційную сферу.*

## Уводзіны

"Свядомасць, якая не ўяўляе ўсведамленне чагосьці, была б абсалютным нічым" [1, с. 96]. У філасофскім выслоўі Ж.-П. Сартра сцвярджаецца аналітызм у дачыненні да знакаў існавання як галоўная ўласцівасць свядомасці. У працэсе такога асэнсаванага спасціжэння рэчаіснасці аналітычным мысленнем атаясамліваюцца мікра- і макракосмас, нейтралізуецца апазіцыя "слова-рэч", сцвярджаецца цэласнасць навакольнага свету. Усебаковы аналіз па-мастацку выяўленага прадметна-рэчыўнага свету раскрывае яго функцыі ў сферы індывідуальнага існавання і сацыяльных адносін. Рэчы атаясамліваюцца з унутраным светам іх стваральнікаў, уладальнікаў, перадаюць жывую энергетыку чалавечых стасункаў, пэўных грамадска-сацыяльных норм. Чым больш высокаарганізаваны, складаны, гетэрагенны прадметны свет, тым больш ён выклікае да сябе пачуццяў, адносін і абавязкаў, заахвочвае памкненні да ўпарадкаванасці і гарманізацыі наваколля. У славянскіх народаў – беларусаў, рускіх, украінцаў – словы "речь" (мова) і "рэч", як відаць, маюць амаль аднолькавае гучанне, і гэта акалічнасць падкрэслівае тоеснасць, асаблівы статус рэчаў у духоўнай і прасторавай арганізацыі рэчаіснасці, якой надаецца аформленасць і асэнсаванасць. Уяўленні пра жывапісна пластычны і маляўнічы свет прыроды і рэчаў у мастацкім творы праламляюцца праз аўтарскае вобразна-метафарычнае мысленне, насычаюцца

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

аксіялагічным патэнцыялам, сугестыўнасцю, маральна-духоўнай і этыка- філасофскай сканцэнтраванасцю.

Рэчыўна і пачуццёва змястоўнай, неад'емнай часткай чалавечага існавання з'яўляецца ежа. Матыў ежы адносіцца да вечных у мастацкай літаратуры. Няцяжка заўважыць, што ў творах многіх мастакоў слова феномен гасціннасці і звязаны з ім працэс спажывання ежы задаюць важнейшыя анталагічныя параметры паўнакроўнага быцця, якое можа здзейсніцца толькі пры дапамозе сустрэчных зрухаў "я" да іншага, застольнай размовы з другім чалавекам.

**Асноўная частка**

Моманту гасціннасці, шчодрасці ў выяўленні чалавечых пачуццяў нададзена важнейшая роля ў многіх творах Якуба Коласа, у тым ліку ў паэме "Новая зямля". Ежа не толькі арганічна, неад'емна і натуральна ўключана ў жыццё герояў, але і стымулюе яго, робіць успрыняцце навакольнага свету больш каларытным, паўнакроўным і цэласным. У творах Якуба Коласа знайшла ўвасабленне гогалеўская традыцыя выяўлення матываў ежы і гасціннасці. Працэс спажывання ежы выступае адметным і сутнасным момантам сюжэтнай арганізацыі многіх гогалеўскіх твораў, у тым ліку аповесці "Старасвецкія памешчыкі", аб'ядноўвае мастацкую прастору: герояў паміж сабою і з навакольным светам, рэчы, прыроду, абстрактрактныя паняцці, з'яўляецца нібы першаэлементам, што забяспечвае гарманічнае суіснаванне ўсіх складнікаў гэтай прасторы. Гасціннасць – адметная характаралагічная рыса старасвецкіх памешчыкаў: "Гость должен был непременно остаться; но впрочем, вечер в низенькой теплой комнате, радушный, греющий и усыпляющий рассказ, несущийся пар от поданного на стол кушанья, всегда питательного и мастерски изготовленного, бывает для него наградою" [2, с. 17]. Гогаль, ужываючы прыём гіпербалізацыі, канстатуе "страшэннае мноства" садавіны і гародніны, страў і розных прысмакаў, што характарызуе як адметную якасць герояў, якія "по старинному обычаю старосветских помещиков очень любили покушать", і такой натуральнай аклічнасці, што "благословенная зямля производила всего в таком множестве". Гогаль падрабязна спыняецца на тых прыемных момантах, калі "на столе вдруг появлялась скатерть" і пачынаўся працэс снедання, абеду, закусвання, перакусаў і г.д. З веданнем справы мастак звяртае ўвагу на смакавыя якасці ежы, "апетытныя вырабы даўняй кухні", разгортвае каларытныя і яскравыя апісанні простых, прыгатаваных з майстэрствам і любоўю страў. Усе гэтыя шматлікія дробязі кулінарна-кухоннага абіходу фарміруюць канцэптуальна-ёмістую пазіцыю сцвярджэння ўнутранага свету герояў, іх узаемнай прывязанасці, высокіх і моцных пачуццяў. Несуцешную тугу Афанасія Іванавіча пасля смерці Пульхерыі Іванаўны трапна перадаюць паводзіны за сталом: страціўшы смак ежы, ён страціў смак жыцця. "Паэтыка аповесці будуецца на шматлікім эфекце недагаворанасці, парушэнні правілаў... Вобразы ежы і іншых ніжэйшых чалавечых

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зрухаў... раптам засвяціліся новым святлом, загаварылі пра глыбокую і неадольную духоўнасць" [3, с. 152]. Звычайнае і штодзённае эмпірычнае дзеянне – ужыванне ежы – набывае статус экзістэнцыйнага акта, ежа звязваецца з жыццём, выступае як змястоўная, ёмістая яго характарыстыка.

У адрозненне ад гогалеўскіх апісанняў, у якіх найперш уражвае "застольны максімалізм" (колькасць, разнастайнасць, памеры страў, смакаванне кулінарных тонкасцей і незвычайных вынаходніцтваў), у коласаўскай паэме, і гэта натуральна, галоўным выступае момант не смакаваня, а ўрачыстасці, святочнасці ў апісанні эстэтычных і ўзнёслых момантаў застолля. Яно заўсёды падаецца як святочная цырымонія, таінства, заслужаны вынік руплівай працы беларуса, непасрэдным чынам звязана з "мудрым словам", духоўным яднаннем герояў:

– Дай Божа! – разам адказалі.
... А на стале тым рай ды годзе,
Што рэдка трапіцца ў народзе,
Ляжала шынка, як кадушка,
Румяна-белая пампушка,
Чырвона зверху, сакаўная,
Як бы агонь на ёй палае,
А ніз бялюткі, паркалёвы;
Кілбасы-скруткі, як падковы,
Між сцёган, сала і грудзінак
Красуе ўсмажаны падсвінак,
Чысцюткі, свежы і румяны,
Як бы паніч той надзіманы.
...Са смакам елі і багата –
На тое ж даў Бог людзям свята [4, с. 205].

Феномен ежы, здаўна пазначаны трывалай тэндэнцыяй да пазбаўлення банальна-утылітарнай трактоўкі і набыцця пашырана-сімвалічнага тлумачэння. Ужыванне ежы ўзнімаецца на этычную вышыню, пачынае адыгрываць ролю важных чыннікаў існавання не толькі як фізіялагічная патрэба, але і, адначасова, як значны момант духоўнага насычэння чалавека, яднання яго з наваколлем. У сумесных трапезах герояў "Новай зямлі" ежа і сімвалізуе яднанне, якое выступае неабходнай умовай духоўнага сваяцтва.

Відэльцы дружна разбіраюць
І гуртам яйкі ачышчаюць,
І па кусочку іх бяруць,
Крыху падсольваюць, ядуць [4, с. 205].

Ежа не толькі аб'ядноўвае ўдзельнікаў трапезы, у працэсе застолля знікае мяжа паміж жывым і нежывым, і ежа ў пэўным сэнсе садзейнічае фізічнаму яднанню са светам. М. Булгакаў зазначыў: "ежа ёсць натуральнае прычашчэнне, далучэнне да плоці свету. Калі я прымаю ежу, я ўжываю светавую матэрыю наогул, я далучаюся да плоці свету і тым

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

самым рэальна, на самай справе знаходжу свет у сабе, а сябе ў свеце, раблюся яго часткай" [5, с. 71]. У коласаўскай паэме стравы трапна параўноўваюцца з рэаліямі прыродна-рэчыўнага свету і ў пэўнай ступені атаясамліваюцца з імі: "сыр як першы снег бялюткі, / Каўбас прыемнейшыя скруткі, / Што толькі ёсць у Беларусі", "пірагі як сонца ззялі", "ляжала шынка, як кадушка" і г.д.

Паэтычна ўспрыняты і асэнсаваны працэс спажывання ежы набывае значэнне духоўнага напаўнення чалавечага арганізму, шчодрага насычэння душы. Гэта той выпадак, калі "аб'ектыўная фактычнасць і прыгажосць матэрыяльнай формы ўзведзена да ступені паслухмянага выяўлення "звышматэрыяльных" духоўных каштоўнасцей" [6, с. 84]. У коласаўскай паэме застольны этыкет цесна звязаны з сістэмай рэлігійна-абрадавых вераванняў беларуса. Гэта нядзельны сняданак, прымеркаваны да Мядовага Спасу "падгляд пчол", калядная вячэра, велікоднае застолле. Заснаваныя на веры спрадвечныя звычаі разам з руплівай штодзённай працай выступалі гарантамі ўстойлівага жыццёвага парадку, глыбокай прыстойнасці, з'явіліся прыкметамі трывалага сацыяльнага ўкладу, далучыліся да фундаментальных асноў жыцця.

Падкрэсленая эстэтызацыя, дэталёвае афармленне Якубам Коласам працэсу ежы, нават узвядзенне яго ў ранг рытуалу ў складаныя часы стварэння паэмы (1911 – 1923 гг.) на фоне ўсеагульнага разладу і разбурэння, якімі суправаджаліся рэвалюцыі, імперыялістычная і грамадзянская войны, набывалі пэўны раздражняльны эфект і маглі быць успрыняты як выклік. Апісанні, напрыклад, святочнай вячэры, калі "У хаце добры лад і згода, / Як патрабуе і прыгода, / Паважнасць вечара святога", узгадванне пра белы настольнік, горы скавародак, падсмажаных акунькоў, мянькоў і плотак, верашчакі, блінчыкаў на маку і г.д. выступалі знакамі трываласці і дабрабыту, пераемнасці і захавання шматвяковых традыцый. Прэзентацыя з веданнем справы ўсіх прысмакаў на святочных сялянскіх застоллях Коласам адкрыта супрацьпастаўлялася незайздроснай сітуацыі аскетызму і "пайковай суматы":

Крыніцы бурнага натхнення,
Мінут вясёлых ажыўлення,
Стаяць, як біскупы, бутэлі,
І ласа ўсе на іх глядзелі.
Ляжыць гарамі ў іх падножжы
Закуска, гэта міласць божа:
Тут сыр, як першы снег бялюткі,
Каўбас прыемнейшыя скруткі,
Што толькі ёсць у Беларусі [4, с. 112].

Прыемна здзівіўшы чытача апісаннямі пышнага і багатага застолля, якое падаецца як дастаткова тыповая і натуральная з'ява, аўтар раптоўна парушае інерцыю пералічэння прысмакаў, сутыкае паэзію з прозай сучаснага яму гістарычнага моманту, канстатуючы ў ім крызісныя факты адсутнасці ежы:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

А масла!.. Не! маўчу: баюся
У час пайковай суяты
Дражніць пустыя жываты! [4, с. 483-484]

## Заключэнне

Праз этыку сумеснай трапезы праяўляецца глыбіня і змястоўнасць унутранай працы чалавека, яго камунікатыўныя здольнасці, патэнцыяльныя магчымасці асваення і асэнсавання навакольнага свету, уласнага сцвярджэння і здзяйснення ў ім. На прыкладзе прааналізаваных класічных твораў раскрываецца сэнсаўтваральны патэнцыял спецыфічнай часткі прыродна-рэчыўнага свету, які выводзіць яе за межы ўласна-гастранамічных значэнняў у быційныя сферы. Хлеб і соль, віно і стравы ляжаць у аснове ўзаемаразумення людзей, фарміруюць іх анталагічнае адзінства, агульную гарманічную ўлучанасць у сусвет.

### *ЛІТАРАТУРА*

1. ***Сартр, Ж.-П.*** Бытие и ничто / Ж.-П. Сартр. – М.: Республика, 2001.
2. ***Гоголь, Н.В.*** Собрание сочинений в семи томах / Н.В. Гоголь. – М.: Художественная литература, 1984. – Т. 2.
3. ***Манн, Ю.В.*** Иерархия духовных и физических способностей / Ю.В. Манн // Поэтика Гоголя: Вариации к теме. – М.: Coda, 1996.
4. ***Колас, Якуб.*** Збор твораў у чатырнаццаці тамах / Якуб Колас. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1974. – Т. 6.
5. ***Булгаков, С.Н.*** Философия хозяйства / Н.С. Булгаков. – М.: Наука, 1990.
6. ***Дворжак, М.*** Очерки по искусству Средневековья / М. Дворжак. – М.: Огиз-Изогиз, 1934.

Паступіў у рэдакцыю 18.03.2009 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова